## Новае выданне па БМЗ




R. Kaleta, *Błędologia w glottodydaktyce białorutenistycznej*, Warszawa 2018.

У Майстэрні беларусістычнай глотадыдактыкі кафедры беларусістыкі Варшаўскага ўніверсітэта (гл. http://kb.uw.edu.pl/pracownia-glottodydaktyki-bialorutenistycznej/) у 2018 годзе была выдадзеная на польскай мове манаграфія к.ф.н. Радаслава Калеты *Błędologia w glottodydaktyce białorutenistycznej* (*Памылкалогія ў беларусістычнай глотадыдактыцы*), прысвечаная беларусістычнай глотадыдактыцы і моўным памылкам палякаў, якія вывучаюць беларускую мову як замежную. Польскі тэрмін *błędologia* азначае навуку пра памылкі (адсюль беларускі неалагізм *памылкалогія*), якую ў Польшчы называюць таксама тэрмінам *lapsologia* (беларуская калька *лапсалогія*). У кнізе даецца шырокая інфармацыя пра гісторыю і сучасны стан беларускай мовы (таму што польскаму чытачу большасць фактаў малавядомыя), а потым сцвярджаецца само існаванне такой навукі як беларусістычная (беларусазнаўчая) глотадыдактыка (у Беларусі больш папулярны тэрмін *лінгвадыдактыка*). Гэта тэарэтычныя разважанні, якія дагэтуль не былі шырока апісаныя і нават не мелі сфармуляваных паняццяў і тэрмінаў у літаратуры, прысвечанай вывучэнню беларускай мовы як замежнай. Менавіта з гэтай прычыны ў кнізе прадстаўленыя розныя вызначэнні такой галіны навукі, як беларусістычная глотадыдактыка, а таксама ўпарадкаваная тэрміналогія, напрыклад, было ўдакладненае значэнне тэрмінаў *глотадыдактыка, беларусістычная глотадыдактыка*, *родная мова*, *замежная мова*, *другая мова*, *успадкаваная мова*, *адноўленая мова* і г.д. у параўнанні з дэфініцыямі і тэрмінамі, якія ўжываюцца ў Польшчы, Беларусі і Расіі. Гэта наўмысныя спасылкі да т.зв. параўнальнай глотадыдактыкі, у кантэксце якой беларусістычная глотадыдактыка таксама дагэтуль яшчэ не вывучалася. У наступнай частцы працы прадстаўленыя вынікі анкетных даследаванняў, праведзеных сярод тых, хто вывучае беларускую мову як замежную ў розных гарадах і навукова-дыдактычных асяродках Польшчы. Даследаваліся таксама матывацыя і адносіны да вывучэння беларускай мовы, а таксама віды і роля стэрэатыпаў пра беларускую мову. Вынікі даследавання руйнуюць стэрэатыпны погляд на прадмет даследавання, які дагэтуль існаваў. Таксама прадстаўленыя глотадыдактычныя дапаможнікі, якія выкарыстоўваюцца ў навучанні/вывучэнні беларускай мовы. Іх колькасць і разнароднасць таксама руйнуюць стэрэатыпы пра беларускую мову як пра, нібыта, непапулярную і сведчаць пра існаванне попыту на матэрыялы да вывучэння беларускай мовы як замежнай. У манаграфіі прадстаўлены агляд тыпалогіі моўных памылак замежнікаў, якія вывучаюць розныя мовы як замежныя. Гэтыя разважанні выяўляюць існаванне розных перспектыў у даследаванні моўных памылак, а таксама ўводзяць ў прэзентацыю аўтарскай тыпалогіі моўных памылак, якой прысвечаны апошні раздзел манаграфіі. У ім прааналізаваныя асаблівасці выкладання беаларускай мовы польскамоўным навучэнцам, у тым ліку памылкі палякаў, якія вывучаюць беларускую мову як замежную; паказаная тыпалогія памылак разам з канкрэтнымі прыкладамі; апісаныя прычыны і вынікі памылак ды іх уплыў на глотадыдактычны працэс. Гэтае пытанне таксама не было раней даследаванае ў межах беларусістыкі на такім узроўні, хаця існуе шмат літаратуры на гэтую тэму для іншых моў. Дадзеная манаграфія запаўняе прагал ў беларусістычных даследаваннях у гэтай галіны.

Кніга даступная ў Мінску ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі і ў Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Набыць яе можна толькі запаўняючы фармуляр, даступны на старонцы кафедры беларусістыкі (гл. http://kb.uw.edu.pl/2018/06/13/bledologia-w-glottodydaktyce-bialorutenistycznej/)

*Радаслаў Калета*

*Варшава*



3BMZ12.indd 75 01.11.2020 23:12:30